©ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819-3625 № 18-19, 2012

Кірыл Карлюк

Дынастыя і землі. Візуальныя рэпрэзентацыі Вялікага Княства Літоўскага ў каралеўскай прапагандзе Вазаў

Уступ

Перыяд панавання дома Вазаў у Рэчы Паспалітай (1587–1668) прыпаў на час заўважных змен у візуальных практыках легітымацыі каралеўскай улады ў Еўропе. Менавіта на мяжы XVI–XVII стст. назіраецца вялікі рост колькасці (і якасці) друкаванай прадукцыі, твораў мастацтва, афармлення і інстытуцыялізацыі складаных форм каралеўскага цырыманіялу і грандыёзных барочных *festa*, на якія ўскладалася значная функцыя ўмацавання сімвалічнага панавання манархаў.

Як і іншыя эпохі, барока прапанавала свае візуальныя культурныя коды, якія, у сваю чаргу, зрабіліся адмысловым сродкам сацыяльнай камунікацыі, абраным уладай для легітымацыі існуючай палітычнай сістэмы. Падобны выбар быў абумоўлены складаным спалучэннем традыцыйных і новых адносін паміж рознымі пластамі станавага грамадства Еўропы ранняга Новага часу, то бок адносін (камунікацыі) паміж тымі, хто валодаў уладай і рэалізоўваў яе (г. зн. гаспадарамі), і тымі, хто акцэптаваў гэтую ўладу і знаходзіўся ў сімвалічна падначаленым становішчы (г. зн. падданымі).

Поле такіх камунікацый – вельмі складаная піраміdальная іерархія каралёў і князёў, біскупаў і арыстакратаў, вольных гарадоў і правінцыяльных парламентаў, багатых месцічаў і плебсу, бурмістраў і членаў гарадской рады, вясковых супольнасцяў і землеўласнікаў, злучаных паміж сабой тонкімі ніткамі павуціны фармальных і нефармальных адносін, лаяльнасці і легітымнасці. Уся гэтая неабсяжная, хісткая сістэма бясконца ўзнаўлялася ў межах асобных дзяржаў і розных сацыяльных пластоў.

На працягу XVI–XVII стст. яна сутыкалася з сур'ёзнымі выпрабаваннямі (Рэфармацыя, рэлігійныя войны, рост ролі капіталу і ўплыву буржуазіі, грамадзянскія канфлікты), якія выклікалі глыбокі крызіс легітымнасці каралеўскай улады, а у XVII ст. можна казаць ужо пра шматбаковы сістэмны палітычны і эканамічны крызіс (гл. Rabb, 1975; Benedict and Gutmann, 2005; Munck, 1990: 199–236). Распачаты працэс тэрытарыялізацыі дынастычных дзяржаў паставіў пад пытанне нават саму ўладу імпе-

ратара Свяшчэннай Рымскай імперыі як фармальнага кіраўніка манархій хрысціянскага свету. Адказам на гэтыя татальныя выклікі легітымнасці каралеўскай улады ва ўмовах тагачаснага агульнага еўрапейскага крызісу і стаў пошук шляхоў да палітычнай стабільнасці, у тым ліку і пошук новых форм візуальнай прапаганды.

Любая сістэма сімвалаў улады з'яўляецца неад'емным інструментам палітычнага кіравання. Яе візуальная рэпрэзентацыя ёсць эфектыўнай невербальнай мовай камунікацыі эпохі, выпрацаванай у якасці аб'ектыўнага на той момант сацыяльна-палітычнага кампрамісу паміж асобнымі часткамі згаданай вышэй іерархіі. Адначасова візуальныя сімвалы ўлады рэпрэзентуюць адлюстраванне ідэнтычнасці носьбітаў грамадства (зразуметай у самым шырокім сэнсе: станавай, рэлігійнай, этнічнай і гэтак далей).

Відавочна, што даследаванне гісторыі палітычнай улады не абмяжоўваецца толькі пытаннямі аналізу асобных вузкіх сацыяльна-палітычных працэсаў у гістарычным кантэксце. У разгледжаны перыяд барока як асаблівая філасофія і мастацтва канструюе новую сацыякультурную прастору, спараджае новыя формы візуальнай прапаганды. Татальны барочны праект пабудовы новай (мастацкай) рэчаіснасці ўвасобіўся ў тысячах твораў мастацтва, якія прадстаўлялі манархію і манархаў у патрэбным ім выглядзе. Гэта была прадукцыя прапагандысцкага плану, надзвычай багатая на алегарычныя сэнсы, якая ствараласа ў кантэксце шматлікіх дынастычных войнаў і грамадзянскіх канфліктаў гэтага перыяду паралельна з непасрэднымі вайсковымі дзеяннямі і адасабляла супярэчлівыя амбіцыі і памкненні манархаў, была іх візуалізаванай палітычнай праграмай.

Польска-літоўскія гаспадары з дынастыі Вазаў (Жыгімонт III, яго сыны Уладзіслаў IV і Ян II Казімір) не былі выключэннем і надавалі велізарную ўвагу самай рознай візуальнай прапагандзе. Мэты, кірункі і формы гэтай прапаганды былі самыя розныя і наўпрост залежалі ад актуальнай гістарычнай сітуацыі: доўгі і крывавы дынастычны канфлікт за трон Швецыі (які Жыгімонт III страціў у 1599 годзе ў выніку дэтранізацыі), барацьба супраць Рэфармацыі (як унутры краіны, так і геапалітычнае пазіцыянаванне Вазаў у лагеры каталіцкіх манархій Еўропы), войны з Расіяй і Асманскай імперыяй (вобраз абаронцаў лацінскага свету), раялісцкая прапаганда ва ўмовах унутранай апазіцыі значнай часткі шляхты і магнатэрыі (асабліва ў часы абрання Жыгімонта III і крыху пазней падчас рокашу Зэбжыдоўскага) і гэтак далей.

I. Ягелонская тэма

Адным з істотных напрамкаў каралеўскай прапаганды было Вялікае Княства Літоўскае, адна са складовых частак Рэчы Паспалітай, самыя розныя вобразы і сімвалы якога адлюстроўваліся ў візуальных рэпрэзентацыях улады. Разам з тым, улічваючы асноўныя напрамкі палітыкі Вазаў, якія часам вельмі моцна разыходзіліся з інтарэсамі Літвы і яе

эліт (ці часам увогуле ігнаравалі іх), вобразы гэтыя не насілі рэгулярнага ці, тым больш, цэнтральнага месца ў каралеўскай прапагандзе. Больш за тое, можна нават канстатаваць паступовую маргіналізацыю яе ўмоўна "літоўскага дыскурсу", асабліва пазней, у другой палове XVII ст., што было звязана са стратай ВКЛ сваёй палітычнай вагі.

Значнае месца ў візуальных вобразах Літвы Вазы надавалі выгоднай для сябе "ягелонскай" тэме. Пасля дынастычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай, выкліканага смерцю апошняга мужчынскага прадстаўніка дынастыі Гедымінавічаў-Ягайлавічаў у 1572 годзе, і ўсталявання ў тых складаных умовах элекцыйнай формы манархіі, тэма спадчыннай сукцэсіі[1] працягвала займаць ці не ключавое месца ў каралеўскай прапагандзе. Падагрэтая яна была і няўдалай элекцыяй Генрыха Валуа, а таксама пазнейшымі падвойнымі элекцыямі (Стэфан Баторый і імператар Максіміліян II Габсбург, Жыгімонт III Ваза і эрцгерцаг Максіміліян III Габсбург), якія сутыкнулі розныя дынастыі з непрыхаванымі прэтэнзіямі на пераемнасць ад Ягелонаў.

Пасля смерці Жыгімонта II Аўгуста шведскія Вазы (як і значная частка эліт ВКЛ) працягвала ўважаць літоўскі пасад за спадчынны. У свой час яшчэ Юхан III Ваза, кароль Швецыі, бацька Жыгімонта III і муж Кацярыны Ягелонкі (роднай сястры Жыгімонта Аўгуста), недвухсэнсоўна выступіў з дынастычнымі прэтэнзіямі на Літву (і Лівонію) ад імя свайго сына: *"Сын мой – дзедзічны гаспадар Літвы… і няма на Літве вольнай элекцыі"* (Stefana Batorego: 19). Словы гэтыя прагучалі ў 1582 годзе яшчэ пры жыцці Стэфана Баторыя і сталі пэўнага кшталту палітычнай праграмай Вазаў. Пяццю гадамі пазней ужо падчас бескаралеўя, пасля смерці Баторыя, гэтыя словы былі фактычна паўтораныя: *"Такім чынам, кароль шведскі некалькі разоў падкрэсліў, што ад гэтага часу Вялікае Княства Літоўскае і Інфлянты яму належаць… дзеля таго, як ён кажа, Літва ёсць гаспадарствам спадчынным фамілії Ягелонскай, з якой зараз не жыве ніводзін мужчынскі нашчадак акрамя яго сына Жыгімонта, а Інфлянты паддаліся Жыгімонту Аўгусту не як каралю польскаму, а як вялікаму князю літоўскаму."* (O bezkrólewiu, 1864: 468).

Не выпадкова, што пасля ўзыходжання Жыгімонта III на польскалітоўскі пасад, вобраз Літвы (і ў вялікай ступені Польшчы) як спадчынных уладанняў яго продкаў стаў часта фігураваць у візуальнай прапагандзе. Літва атаясамлівалася з мінулай дынастыяй Ягелонаў і непасрэднымі яе прадстаўнікамі, род якіх працягвалі Вазы.

Як слушна заўважыў Юліуш Храсціцкі (Chrościcki, 1982: 35–36), гэта тлумачыцца яшчэ і вострай барацьбой з эрцгерцагам Максіміліянам III Габсбургам, які не без падстаў лічыў сябе таксама спадчыннікам Ягелонаў (старэйшай чэшска-вугорскай

[1] Маецца на ўвазе паслядоўная і заканамерная змена манархаў паводле спадчыннасці.

лініі) і абраным гаспадаром Рэчы Паспалітай (афіцыйна адмовіўся ад сваіх прэтэнзій толькі ў 1598 годзе). Многія прадстаўнікі арыстакратыі ВКЛ (напрыклад, нясвіжскія Радзівілы) падтрымалі ў свой час абранне Габсбургаў (Wisner, 2009: 20–37).

Адна з цудоўных гравюр у шырокім цыкле рэпрэзентацыі генеалагічнай пераемнасці Вазаў ад Ягелонаў і Пястаў была цалкам прысвечаная літоўскай тэме і, верагодна, акрамя знешняй прапаганды была разлічаная і на ўнутранае карыстанне ў ВКЛ. Гаворка пра генеалагічнае дрэва Жыгімонта III Вазы (іл. 1), якое выводзіць яго радавод ад каралёў польскіх і вялікіх князёў літоўскіх, а не ад дробнага шведскага дваранскага роду, якім уласна і былі Вазы яшчэ якое стагоддзе таму.[2] Распрацоўка гэтага міфалагізаванага дрэва належыць вядомаму навукоўцу, юрысту і генеолагу фларэнтыйскага паходжання Антонія дэлі Альбіцы, а яго мастацкае ўвасабленне – бліскучаму фламандскаму мастаку Дамініку Кустасу. Паходзіць яно з генеалагічнага выдання Альбіцы, прысвечанага еўрапейскім кіруючым дынастыям таго часу, якое носіць назву *Principum christianorum stemmata*.[3]

Нягледзячы на тое, што гравюра досыць вядомая, польскія даследчыкі звычайна мімаходзь згадваюць пра яе, улічваючы, што найбольш распаўсюджанай візуалізацыяй прапагандысцкага варыянта генеалагічнага дрэва Вазаў быў знакаміты стылізаваны *Белы Арол* Томаша Трэтара, упершыню выдадзены ў траўні 1588 года ў разгар барацьбы за польска-літоўскую карону (Chrościcki, 2001: 48–51). Апошняя, безумоўна, паўплывала і на дрэва, складзенае Альбіцы.

Іл. 1. Генеалагічнае дрэва Жыгімонта III Вазы. ***Д. Кустас, Аўгсбург, 1612 год.***

У святле азначанай тэмы гравюра Кустаса ўяўляецца для нас вельмі цікавай. Акрамя ўласна інтэрпрэтацыі генеалогіі, у якую былі ўпісаныя Пясты, Ягелоны і нават Стэфан Баторый ды Генрых Валуа, а вянчаў яе Жыгімонт III, вялікую цікавасць вы-

[2] Такія звесткі ўвогуле не віталіся, як, напрыклад, тагачасны знішчаны панегірык Шымона Старавольскага, які згадваў некаранаваных продкаў Жыгімонта Вазы з ліку простага шведскага дваранства.

[3] Упершыню надрукавана ў 1612 годзе ў Аўгсбургу, гл.: (Albizius, 1612: XIX).

клікае выбар двух істотных кампазіцыйных элементаў: фонавы краявід Гародні і асобна дададзеная выява Пагоні злева (нягледзячы на наяўнасць дынастычнага герба Жыгімонта III зверху).

Сама выява Гародні (як і іншых гарадоў у выданні) з'яўляецца копіяй вядомай гравюры з кнігі Георга Браўна і Франца Гогенберга *Civitates orbis terrarum* (Braun, and Hogenberg,, 1575), якая, у сваю чаргу, ёсць запазычаннем з больш ранняй гравюры Маціяса Цюнда 1568 года са сцэнай прыёму маскоўскага пасла на першым плане. Важны момант тут, чаму аўтар абраў менавіта гэты горад, а не адзін з польскіх, напрыклад. Ці было гэта зроблена інтуітыўна, ці несла нейкае сімвалічнае значэнне? На момант выдання працы Альбіцы Гародня – традыцыйна, яшчэ ад часоў Вітаўта і Казіміра Ягелончыка, адна з вельмі важных рэзідэнцый вялікіх князёў, поўнасцю пераўвасобленая Стэфанам Баторыем у рэнесансавым і маньерыстычным стылях. Верагодна, такі выбар фону быў зроблены пад непасрэдным уплывам аднаго з паслоў Жыгімонта III, такіх як, напрыклад, ксёндз Станіслаў Рэшка, што прыкладалі вялікія намаганні дзеля легітымацыі правоў новага караля ў вачах еўрапейскіх каталіцкіх двароў. Па ідэі генеалагічнае дрэва Жыгімонта III як маніфеставанага Ягелона глядзелася вельмі ўдала на фоне краявіду старажытнага літоўскага горада, у зямлю якога яно фактычна алегарычна сыходзіла карэннем. У выніку цесна звязаная з вобразам Гародні-*Літвы* візуальная рэпрэзентацыя генеалогіі караля мусіла выклікаць пазітыўную рэакцыю ў значнае часткі эліт ВКЛ з іх відавочнай прыхільнасцю да ідэі спадчыннасці колішняй літоўскай дынастыі.

Вобраз Літвы-*дынастыі*, ягелонскай Літвы, так ці інакш таксама шырока рэпрэзентаваны ў шэрагу тыражаваных *Icones*, кніг з галерэямі гістарычных уладароў Літвы і Польшчы, якія прадстаўлялі Жыгімонта III сярод партрэтаў Пястаў, Анжу і, натуральна, Ягелонаў (Chrościcki, 1982: 36–39).

Гэты ж вобраз прысутнічаў падчас шматлікіх барочных працэсій, цырымоній, трыумфаў. Так, напрыклад, падчас каранацыйнага ўезду Жыгімонта III у Кракаў у дэкарацыях маньерыстычных трыумфальных брамаў былі змешчаныя партрэты Ягайлы, Казіміра Ягелончыка, яго сыноў Яна Ольбрахта, Аляксандра, Жыгімонта Старога (дзеда Жыгімонта Вазы) і Жыгімонта II Аўгуста. Гэта нават стала традыцыяй, і ў 1648 годзе падчас каранацыі Яна II Казіміра на трыумфальных брамах у Кракаве былі *"выразаныя і намаляваныя ўсе каралі з Ягелонскага дома аж да цяперашняга найяснейшага караля Я[го]М[осці] Яна Казіміра IV* [sic!], *якога таксама на кані пры зброі выявілі прыгожа з рэгіментам, у лаўровым вянку, а за ім войска вялікае..."* (цыт. пав. Rożek, 1976: 85). Гэтая традыцыя фактычна пратрывала да апошняй чвэрці XVII ст., калі ідэі шляхецкага рэспубліканізму і сарматызму патрабавалі ўжо крыху іншых якасцяў ад кандыдатаў, чым іх крэўная повязь з гістарычнымі манархамі як Літвы, так і Польшчы. У 1669 годзе падчас каранацыі Міхала Карыбута Вішнявецкага

апошні раз новаабраны манарх Рэчы Паспалітай маніфеставаў сваё паходжанне ад літоўскай дынастыі Ягелонаў праз візуальныя вобразы: на трыумфальных брамах былі змешчаныя партрэты Ягайлы і яго пляменніка Жыгімонта Карыбутавіча, які лічыўся адным з легендарных продкаў Вішнявецкіх (Rożek, 1976: 107).

II. Цырыманіял і рэпрэзентацыі Літвы

Паколькі тут мы спыніліся на цырыманіяльным абсягу, варта адзначыць яшчэ адну форму візуальнай рэпрэзентацыі Вялікага Княства Літоўскага падчас каралеўскіх урачыстасцяў. У ранні Новы час асноўнымі рэпрэзентантамі карон і зямель, акрамя, натуральна, манарха, была арыстакратыя, вышэйшыя дыгнітарыі і ўпаўнаважаныя прадстаўнікі мясцовых парламентаў ці вольных гарадоў. Іх прысутнасць падчас пампезных, шматгадзінных барочных урачыстасцяў з іх складанай структурай і багатымі формамі была абсалютна неабходнай і часта ўваходзіла ў склад іх непасрэдных адмысловых рэпрэзентацыйных функцый ад імя зямлі ці кароны, падданымі якой яны з'яўляліся. Безумоўна, што такія ўрачыстасці святочнага ці жалобнага зместу ў Рэчы Паспалітай, як каранацыі, каралеўскія вяселлі, пахаванні, уезды ў гарады, не маглі абысціся без прадстаўнікоў Літвы, якія падчас іх мусілі рэпрэзентаваць свой край у самай рознай форме.

Так, напрыклад, у 1637 годзе падчас урачыстага ўезду ў Кракаў, шлюбу і каранацыі Цэцыліі Рэнаты Габсбург, жонкі Уладзіслава IV Вазы, Літва была прадстаўлена шырокай дэлегацыяй, сярод якой былі Крыштаф, Альбрэхт Станіслаў і Аляксандр Людвік Радзівілы, Стэфан Пац, Казімір Леў Сапега і іншыя ўплывовыя асобы. Разглядзім гэту падзею і месца ў ёй Літвы крыху падрабязней.

11 верасня вялікі гетман літоўскі і ваявода віленскі князь Крыштаф Радзівіл, які ўзначаліў вялікую дэлегацыю літоўскіх сенатараў на аўдыенцыі ў каралевы ва Уяздове, азнаймаваў ад імя Вялікага Княства прывітальнае слова (Radziwiłł, 1980: 43). А 13 верасня ён жа рэпрэзентаваў Літву на каранацыі каралевы, калі асабіста нёс адзін з самых значных сімвалаў манаршай улады – скіпетр (Opis wjazdu, 1662: 177). Пазней Крыштаф Радзівіл і яго сваяк літоўскі канцлер Альбрэхт Станіслаў Радзівіл паднеслі каралеве Цэцыліі Рэнаце каштоўныя падарункі (Opis wjazdu, 1662: 180). Гэта ж зрабіла і дэлегацыя месцічаў сталічнай Вільні, якая разам з іншымі гарадамі Рэчы Паспалітай паднесла каралеве падарункаў агульным коштам на 200 тысяч польскіх злотых (Falniowska-Gradowska, 1991: 35).

Традыцыя гэтая, безумоўна, была не новай, але ў фармаце тых працэсаў, якія адбываліся ў той час у Рэчы Паспалітай – спробы стварэння асаблівай, новай палітычнай культуры мяшанай манархіі, *dominium politicum et regale,* – яна набыла новую афарбоўку (Friedrich, 2004: 389–391). Магнаты пачалі з'яўляцца на афіцыйных урачыстасцях не толькі ў вялікай кампаніі шляхты, сваіх кліентаў, але атачоныя вялікімі вайсковымі аддзеламі, як коннымі, так і пяхо-

тай, узброенымі, багата ўбранымі і аздобленымі – да такой ступені, што, як пісалі сучаснікі, *non facile dictu est* (Wassenbergius, 1643: 246). Такім чынам, падкрэсліваўся не толькі бляск асобнага ўласнага арыстакратычнага дома, але і магутнасць усяго Вялікага Княства Літоўскага.

Так, падчас згаданых святкаванняў у 1637 годзе сярод дваццаці харугваў пяхоты ў чырвоных і блакітных мундзірах, якія бралі ўдзел у каранацыйнай працэсіі, літоўскім дыгнітарыям належылі: шостая (у парадку) – маршалку літоўскаму Аляксандру Людвіку Радзівілу, сёмая і восьмая – надворнаму маршалку Казіміру Льву Сапегу, дзявятая – канцлеру Альбрэхту Станіславу Радзівілу, дзясятая – падканцлеру літоўскаму Стэфану Пацу, дванаццатая – падкамораму Янушу Радзівілу і чатыры (трынаццатая, чатырнаццатая, пятнаццатая і шаснаццатая) – вялікаму гетману Крыштафу Радзівілу. За імі ішлі шматлікія конныя пошты літоўскіх магнатаў: *"Wszyscy zbrojno, strojno, piórno, od złota, od srebra, rzędów i siedzenia bogatego, w tygrysach i lampartach jedni, welensach bławatnych drudzy"* (Opis wjazdu, 1662: 175). Улічваючы такі пышны фармат працэсій, цягнуліся яны бясконца доўга: напрыклад, урачысты ўезд каралеўскай пары Жыгімонта III і яго жонкі эрцгерцагіні Ганны Габсбург 26 траўня 1592 года ў Кракаў, у якім брала ўдзел 27 карэт, дзясяткі конных і пяхотных палкоў, прадстаўнікі горада, цэхаў, шляхты і гэтак далей, цягнуўся, па словах сведкі Леанарда Насінгера, з трох гадзін да паловы на сёмую (Nassinger, 2004: 414).

Сама сутнасць і форма цырыманіялу, безумоўна, не была нейкай забаўкай ці звычайнай цікавосткай, як гэта можа падацца з сучаснага гледзішча. Яшчэ ў XVI ст. з'явіліся трактаты, якія абгрунтоўвалі неабходнасць непасрэднай сімвалічнай рэпрэзентацыі зямное іерархіі. Як зрабіў гэта ў 1529 годзе французскі юрыст і тэарэтык права Бартэлемі дэ Шасэньё, кіраўнік праванскага правінцыйнага парламенту, у *Catalogus de gloriae mundi,* падкрэсліваючы, што дзеля дасягнення прэстыжу манархіі неабходна *візуалізаваць* сацыяльныя рангі (Chasseneux, 1529). Г. зн. візуальна падкрэсліць праз сістэму сімвалаў існую станавую іерархію як праекцыю нябеснага парадку на зямлі.

Цягам XVII–XVIII стст. вялікі крок у гэтым кірунку таксама зрабілі фармалізаваныя кнігі прыдворнага этыкету (Францыя, Гішпанія, Аўстрыя і інш.), якія рацыяналізавалі рытуал у строгую сістэму візуальнага цырыманіялу. У эпоху Вазаў гэтыя формы атрымалі сваё лагічнае развіццё, а візуальныя рэпрэзентацыі ўлады шырока распаўсюдзіліся ў грамадстве праз самыя розныя медыі, як у якасным, так і ў колькасным сэнсе, на што паўплывала і барочнае мастацтва. Больш за тое, гэты працэс прывёў да таго, што візуальныя формы легітымацыі ўлады, у першую чаргу, цырыманіял, набылі ў гэты час інстытуалізаваную, а ў чымсьці нават навуковую форму. Напрыклад, у выглядзе дакладна фармалізаванага прыдворнага этыкету ці рацыяналізаванага нямецкага *Zeremonialwissenschaft* (Mörke, 2003: 33–37).

Гэта было істотным крокам для пераадолення шэрагу выклікаў, звязаных з крызісам легітымнасці ўлады, пра які згадвалася вышэй. Менавіта на легітымнасці, веры ў слушнасць кіравання, трывала сімвалічная моц улады і палітычная стабільнасць (Bourricaud, 1987: 59). Кожны чалавек, кожны стан і кожная зямля (што істотна ў нашым выпадку) займалі асаблівае месца ў гэтым сацыяльна-палітычным полі, у межах якога легітымацыя ўлады з'яўлялася неабходным перманентным працэсам, калі ўладар канструяваў веру ў сваю легітымнасць у вачах набліжанага кола (штаба кіравання, паводле вызначэння Вэбера) (Weber, 1978: 213), а эліты легітымізавалі ўладу ў вачах іншых колаў: уладар — эліты — падданыя ці ўладар — кароны/землі — лакальнасці — гарады/вёскі.

Такая складаная структура была асабліва рэлевантнай для сістэм улады ранняга Новага часу з іх пэўна акрэсленай іерархічнай (пірамідальнай) сацыяльнай структурай, у якой па-ранейшаму вельмі яскрава вылучаюцца згаданыя элементы. На гэта звярнуў увагу Родні Баркер (Barker, 2001: 47–49), які заўважыў, што ў Еўропе *ancien régime* падданыя вельмі рэдка, а часам нават ніколі не бачылі сваіх манархаў. Таму тыя шматлікія цырымоніі і іншыя візуальныя практыкі легітымацыі ўлады, дзеля ўзроўню тагачасных медыяў, выконваліся толькі на вачах лічаных людзей: эліты, прыдворных, жыхароў сталіцы і буйных гарадоў.

Падобныя структуры мелі вельмі дакладны і трывалы характар. У выпадку Рэчы Паспалітай яго добра бачна на прыкладзе фармалізаванага парадку паседжання сенату (іл. 2), падрабязна акрэсленага і з адсылкай сучаснікаў да антычных рымскіх тра-



Іл. 2. Пасяджэнне сойма Рэчы Паспалітай. ***Дж. Лаўра, Рым, 1622 год.***

дыцый: кароль у цэнтры пад балдахінам, сенатары (у тым ліку і літоўскія) займалі месцы паводле іерархіі службовых пасадаў і *зямель.* З правага боку ад караля знаходзіўся прымас, з левага – арцыбіскуп львоўскі, потым іншыя біскупы (улучна з віленскім), кракаўскі каштэлян, іншыя польскія і літоўскія ваяводы і каштэляны. Ілюструючы гэту іерархію, у час сойму 1626 года ксёндз Фабрыцыус Валенты Гроза у сваёй касцельнай казані звярнуўся да шляхты з яскравай прамовай, у якой, па словах сведкі, *"караля Ягамосць назваў сонцам і золатам, а нас усіх зоркамі, жалезам і меддзю, потым – арлом, а нас крумкачамі і вераб'ямі, і казаў кланяцца яму і слухаць, што ён кажа".*[4]

На сценах соймавай залы змяшчаліся гербы зямель у іх іерархіі ў адпаведнасці з каралеўскім тытулам: *rex Poloniae, magnus dux Lithuaniae, Russiae, Prussiae, Masoviae, Samogitiae, Livoniae etc.* Так, як мы можам бачыць гэта на гравюры Джыякама Лаўра 1622 года, выдадзенай у Рыме: злева направа змешчаны гербы Вялікапольшчы, Малапольшчы, Літвы, Русі, Прусіі, Мазовіі, Жамойці, Лівоніі і далей іншых зямель. Прыкладна такую ж традыцыйную іерархію дынастычных і зямельных гербаў можна бачыць і на тытульным лісце да кракаўскага выдання *Statuta y Metryka* Станіслава Сарніцкага 1594 года (Sarnicki, 1594).

Такім чынам, месца кароны, зямлі, у нашым выпадку Вялікага Княства Літоўскага, у структуры цырымоній і візуальнай сімволікі ўлады вызначалася паводле яе фармальнага і нефармальнага статуса, тытулатуры, традыцыі і, натуральна, палітычнай вагі. У залежнасці ад трансфармацыі гэтых фактараў на працягу панавання дынастыі Вазаў змянялася і месца ВКЛ у гэтай мадэлі. У часы панавання Жыгімонта III і асабліва Уладзіслава IV Вільня і Літва былі як адносна актыўнымі суб'ектамі, так і аб'ектамі візуальнай каралеўскай прапаганды. Каралеўскі двор па-ранейшаму часта знаходзіўся ў літоўскай сталіцы, якая грала ролю сцэны, на якой разгортваліся барочныя спектаклі[5] святочных уездаў і іншых урачыстасцяў. Тут часта прымаліся паслы іншаземных дзяржаў, як, напрыклад, у 1636 годзе граф Жан дэ Круа-Сольр, амбасадар гішпанскага караля (Radziwiłł, 1980: 553–554). Праз гэта не абыходзілася без канфліктаў з польскімі сенатарамі, як у 1648 годзе, калі Уладзіслаў IV жадаў сустрэць французскага пасла маркіза Луі дэ Арпажона і зладзіць цырымонію прыняцця Ордэна Святога Духа ў Вільні. Пад ціскам кароннага канцлера Ежы Асалінскага цырымонія была перанесена ў Варшаву (зрэшты, з прычыны смерці манарха яна так і не адбылася) (Vorbek-Lettow, 1968: 165–176). Відавочна, што значэнне ВКЛ увесь час падала.

[4] Цытуецца па (Augustyniak, 1999: 73).

[5] У прамым і пераносным сэнсе, бо за Уладзіславам IV у Вільні, акрамя каралеўскіх урачыстасцяў, перад дваром (некаторыя прыдворныя нават прыцягваліся да ўдзелу ў іх) рабіліся прафесійныя пастаноўкі (італійскія оперы, балет, камедыі) часта з прапагандысцкім раялісцкім адценнем (гл. Lewański, 1973: 25-60).

Наступнікі Уладзіслава IV на троне збольшага ігнаравалі літоўскую сталіцу, а ўрачыстасці, звязаныя з каралеўскім дваром, тут пачалі мець глыбока правінцыйны характар. Як вядома, пасля вайны 1654–1667 гадоў не аднаўляўся нават вялікакняскі палац, які стаяў у руінах.

Практыкі рэалізацыі каралеўскай улады ва ўмовах паўсядзённасці і іерархіі прыдворнага грамадства вызначалі паводзіны, структураваныя этыкетам, і цырыманіял як шматузроўневую сістэму камунікацый караля, арыстакратыі, падданых, іншых еўрапейскіх паноўных дамоў у якасці своеасаблівай прасторы барочнага *тэатра жыцця* ці *тэатра свету* (паводле вызначэння знакамітага гішпанскага песняра барока Кальдэрона дэ ла Баркі). Прыдворнае грамадства, выдатна інстытуалізаваная і багатая на шматлікія візуальныя сімвалы сістэма, з'яўлялася мікрамадэллю грамадства і адначасова меркаванага нябеснага ладу, якая няспынна легітымізавала ўладу караля, што знаходзіўся на вяршыні прыдворнай іерархіі. Таму парушэнне такога парадку адразу прыводзіла да сур'ёзных канфліктаў, а ў выпадку іх невырашэння – да сістэмнага крызісу. Гэта добра перагукалася з вядомым літоўскім праўным імператывам: даўніны не рушыць, навіны не ўводзіць.

Калі падчас згаданай каранацыйнай працэсіі Цэцыліі Рэнаты *літоўскія* маршалкі пажадалі парушыць традыцыйны парадак і ехаць раней за *каронных*, а вялікі гетман літоўскі Крыштаф Радзівіл увогуле стаў высоўваць прэтэнзіі, што працэсію чамусьці павінен узначальваць менавіта ён, звада цягнулася каля гадзіны. Толькі асабістая ўвага караля, які прысароміў літвінаў, спыніла сварку, а традыцыйны парадак цырымоніі быў адноўлены (Radziwiłł, 1980: 43–44).

III. Вобразы Вялікага Княства: святы Казімір і інтэрпрэтацыі "Пагоні"

Яшчэ адзін сімвалічны вобраз Літвы, які быў вельмі папулярны ў прапагандысцкай праграме Вазаў, – культ святога каралевіча Казіміра, каталіцкага апекуна Вялікага Княства Літоўскага. Жыгімонт III прыклаў велізарныя намаганні для яго паўторнай кананізацыі ў 1602 годзе. Ён жа распачаў будаўніцтва ўражвальнай капліцы святога Казіміра пры Віленскай катэдры, якое завершыць ягоны сын у 1641 годзе. Гэтая капліца зрабілася сапраўдным помнікам панаванню Вазаў як спадчыннікаў дома Ягелонаў на вялікакняскім пасадзе. Пра гэта нагадвае і цудоўная барочная табліца з гербамі Польшчы і Літвы, змешчаная на знешняй сцяне капліцы св. Казіміра, і срэбныя фігуры літоўскіх гаспадароў з дынастыі Ягелонаў і Вазаў, усталяваныя ўнутры. У 1644 годзе ў капліцы адбылася пампезная рэлігійная цырымонія перанясення рэліквіі св. Казіміра. Акрамя таго, у 1604–1618 гадах Жыгімонт III уфундаваў у гонар святога вялікі езуіцкі касцёл у Вільні.

Культ св. Казіміра быў вельмі выгодны для Вазаў як з гледзішча палітычнай прапаганды (падкрэсліваў іх повязь з Ягелонамі), так і з

ідэалагічнай (культ каталіцкага святога, патрона Літвы). Сам візуальны вобраз святога – малады чалавек у вялікакняскай шапцы, чырвонай княскай мантыі на футры (Ярашэвіч, 2002) – асацыяваўся з Літвой і выклікаў згаданыя дынастычныя і рэлігійныя канатацыі (іл. 3).

Іл. 3. Святы Казімір. ***Вільня, 1604 год.***

Іншы істотны вобраз Літвы ў прапагандзе Вазаў – геральдычная і алегарычная рэпрэзентацыя *Пагоні.* Старажытны літоўскі герб нават у выніку свайго сярэднявечнага генезісу, персаніфікацыі ўладара на кані, набыў вельмі папулярны для эпохі барока вобраз каралеўскага коннага партрэта – аднаго з тыповых і вельмі папулярных жанраў візуальнай рэпрэзентацыі манархаў ранняга Новага часу, які зарадзіўся яшчэ ў эпоху Рэнесансу, але сваю прапагандысцкую функцыю набыў ужо ў пазнейшы час у працэсе фармавання барочнага мастацтва. Гэты жанр шырока выкарыстоўваўся прадстаўнікамі дынастыі Вазаў (іл. 4). Прыгадаем іх шматлікія конныя партрэты: жывапісныя, такія як, напрыклад, партрэты Жыгімонта III 1624 года і Уладзіслава IV 1625 года пэндзля Пітэра Паўля Рубенса, або гравіраваныя аўтарства Вольфганга Кіліяна, Вілема Гондзіуса, Фрэдэрыка дэ Віта і інш.

Агульны пасыл коннага партрэта – адлюстраванне караля як дасканалага вершніка, а таксама

Іл. 4. Жыгімонт III Ваза.
Э. Кезер, Франкфурт-на-Майне, 1620-я гады.

ўвасабленне яго годнасці і доблесці, сімвал суверэнітэту каралеўскай улады (кароль упэўнена трымае стырно кіравання, гэтаксама, як ён добра трымаецца на кані) (Von Hagenow, 1998: 61–62). То бок у некаторых выпадках магла быць рэалізаваная добра зразумелая тагачаснаму абывацелю парадыгма *Пагоня-Літва-Гаспадар,* калі спалучаліся матывы алегарычнага партрэта і геральдыкі.

Найбольш яскрава такі вобраз увасоблены ў медалі знакамітага гданьскага медальера Себасцяна Дадлера ў гонар смаленскага вайсковага трыумфу 1634 года караля Уладзіслава IV, які ўслаўляе яго як вялікага вайсковага правадыра (іл. 5). На аверсе змешчаны сядзячы партрэт караля ў поўны рост. Кароль сядзіць на імправізаваным троне з трафеяў (непрыяцельскія харугвы, зброя, марціры, ядры, палонныя маскоўцы і інш.) на фоне вайсковай палаткі. Галаву манарха вянчаюць лаўровым вянком два анёлы. У руках караля рэгімент – сімвал вайсковай улады. Але наш позірк мусіць засяродзіцца на батальнай сцэне, якая разгортваецца ззаду: як град з нябёсаў, на ўцякаючыя ў паніцы маскоўскія войскі падаюць польскія Арлы, а з левага боку іх гоніць і літоўская Пагоня. Пагоня выяўлена досыць дэталёва ў класічнай, традыцыйнай іканаграфіі: вершнік са шчытом з літоўскім шасціканцовым крыжам і з узнятым мячом.

Ланцуг асацыяцый, вылучаны вышэй, тут відавочны. Па-першае, смаленская перамога 1634 года была ў вялікай ступені заслугай войскаў і ваенных лідараў ВКЛ. Па-другое,

Іл. 5. Медаль у гонар перамогі Уладзіслава IV пад Смаленскам. ***С. Дадлер, Гданьск, 1634 год.***

простая аналогія паміж вершнікам і гаспадаром-правадыром недвухсэнсоўна падкрэсліваецца ўласна самой прысутнасцю караля на пярэднім плане ў момант трыумфу. На другім вядомым медалі, які прысвечаны падзеям 1634 года і быў выбіты тым самым Себасцянам Дадлерам двума гадамі пазней, кароль Уладзіслаў IV выяўлены на аверсе і рэверсе на кані. З аднаго боку медаля кароль прымае капітуляцыю маскоўскага ваяводы Міхаіла Шэіна, а з другога ён выяўлены ў час алегарычнага трыумфу перамоў са шведамі і туркамі. Акрамя падкрэсленай годнасці манарха, які такім чынам знаходзіцца вышэй за маскоўцаў, туркаў і шведаў у простым і пераносным сэнсе, мы бачым і семантычную сувязь з ранейшым медалём: сэнс, які быў укладзены Дадлерам у выяву Пагоні, што перамагае ворагаў Рэчы Паспалітай, становіцца яшчэ больш зразумелым.

IV. Геральдыка польска-літоўскіх Вазаў

Іншы цікавы момант звязаны з іканаграфіяй дынастычнага герба Вазаў (па-сутнасці тагачаснага герба Рэчы Паспалітай). Звычайна ён уяўляў сабой падзелены на 9 частак гербавы шчыт з падвойным гербам Кароны і Літвы, а таксама падвойным гербам Швецыі з вазаўскім снапком у цэнтры. То бок Вазы асацыявалі Швецыю і Рэч Паспалітую як дзве кароны пад сваёй уладай, а Літву як неад'емную частку апошняй. З такой інтэрпрэтацыяй вобразу Рэчы Паспалітай і Літвы мы яшчэ сустрэнемся крыху ніжэй. Але тут часам здараліся выключэнні, і Літва адасаблялася як асобная карона, роўная ці ніжэйшая статусам за Польскае і Шведскае каралеўства.

Напрыклад, у шлюбным медалі 1596 года Жыгімонта III і Канстанцыі Габсбург (іх партрэты з тытулам на аверсе) медальера Рудольфа Лемана на рэверсе асобна змешчаныя чатыры гербы: Швецыі (з гербам Вазаў, што не выпадкова, бо Швецыя ўважалася за іх спадчынную вотчыну), польскі Белы Арол і невялікі арол аўстрыйскага дома паміж імі – усе пад каралеўскай каронай над імі, а крыху ніжэй – Пагоня пад вялікакняскай шапкай (іл. 6). З бакоў іх падтрымліваюць алегарычныя стыхіі Вады і Зямлі. Нягледзячы на зразумелую іерархію двух каралеўстваў і Вялікага Княства, варта звярнуць увагу на інтэрпрэтацыю статусу Літвы ў адпаведнасці з яе рэальным палітычным значэннем.

Пра тое, што гэта не выпадковы матыў, сведчыць і медаль Жыгімонта III Вазы невядомага майстра 1608 года. На аверсе мы бачым партрэт караля ў даспехах, а на рэверсе – схематычную выяву трох гербаў (без герба Аўстрыі), акружаных лаўровым

Іл. 6. Шлюбны медаль Жыгімонта III Вазы і Канстанцыі Габсбург.
Г. Леман, 1596 год.

вянком: падвойнага герба Швецыі і асобна Польшчы пад каралеўскай каронай, а пад імі герб Вялікага Княства Літоўскага з вялікакняжацкай шапкай.

Падобны па змесце, але іншы па іканаграфіі варыянт можна сустрэць і на недатаваным медалі Уладзіслава IV аўтарства Ёгана Хёна, адзін з вядомых экзэмпляраў якога захоўваецца ў расійскім Эрмітажы (іл. 7). На аверсе традыцыйная выява караля ў даспехах і карунках, а на рэверсе змешчаны падзелены на чатыры часткі гербавы шчыт пад каралеўскай каронай з гербамі (у геральдычным парадку) Польшчы, Швецыі (Тры Кароны), Літвы і зноў Швецыі (Залаты Леў дынастыі Фолькунгаў). У цэнтры – "Сноп" Вазаў. Герб акружаны ланцугом Ордэна Залатога Руна, ён жа бачны і на шыі манарха на аверсе – своеасаблівая рэпрэзентацыя геапалітычнага выбару польска-літоўскіх Вазаў, падкрэсленая повязь з магутнай каталіцкай дынастыяй імператараў Свяшчэннай Рымскай імперыі і гішпанскіх каралёў. Гэта сведчыла аб праграме стратэгічнай арыентацыі караля, бо прыналежнасць манархаў Еўропы да габсбургскага Залатога Руна, французскага Ордэна Святога Духа, ангельскага Ордэна Падвязак і іншых з'яўлялася ў той час яе адназначнай сімвалічнай маніфестацыяй (Matikkala, 2008: 187-253).

У гэтым выпадку нас зноў найбольш цікавіць месца Літвы, якое адведзена ёй як фактычна раўнапраўнай кароне, нароўні з Польшчай і Швецыяй.

Такі ж матыў мы можам знайсці ў некаторых віленскіх старадруках часоў Вазаў. У панегірыку на смерць Жыгімонта III у 1632 годзе аўтарства Якуба Альшэўскага (Olszewski, 1632) змешчана такая самая выява герба (аўтар гравюры невядомы) з некалькімі дадатковымі элементамі: з польскай каралеўскай каронай і скіпетрам злева, вялікакняскай шапкай і мячом справа (што таксама падкрэслі-

Іл. 7. Медаль Уладзіслава IV. ***Ё. Хён, 1640-я гады.***

вае асобны статус Літвы), трафеямі, лаўровымі вянкамі ды аліўкавымі галінкамі злева і справа адпаведна (іл. 8). Такую ж выяву герба можна знайсці і на гравюры, выкананай Конрадам Гётке, да *Via Augusta... Principem Carolum Ferdinandum* 1644 года (Via augusta, 1644).[6]

Вельмі цікавы, але крыху іншы, набліжаны да класічнай іканаграфіі, герб польскіх Вазаў, можна знайсці на тытульным лісце *Laurae Academicae Serenissimo Poloniarum Regi Vladislao IV* Яна Зяновіча (Zenowicz, 1633).[7] Акрамя шматлікіх алегарычных вобразаў (Апалон на арле, рогі багацця, тытаны і іншыя), варта звярнуць увагу на інтэрпрэтацыю герба: усярэдзіне падвойны герб

Іл. 8. Герб Жыгімонта III Вазы. ***Вільня, 1632 год.***

Іл. 9. Тытульны ліст да *Via augusta, qua Carolum Ferdinandum* з выявай герба Кароля Фердынанда Вазы. ***К. Гётке, Вільня, 1644 год.***

Швецыі, а вакол на асобных кружках у лаўровых вянках падвойныя гербы Польшчы і Літвы; зверху і знізу ў такіх самых кругах – каралеўская карона і вялікакняская шапка.

Кантраст з такой трактоўкай месца Літвы сярод уладанняў Вазаў добра адчуваецца, калі звярнуцца да гравюры Ерэміяса Фалька, на якой адлюстраваная гданьская трыумфальная арка, узведзеная Андрэсам Скато ў 1646 годзе ў гонар караля Уладзіслава IV (іл. 11). На дзвюх калонах узвы-

[6] Гл. ілюстрацыю 9.
[7] Гл. ілюстрацыю 10.

Іл. 10. Тытульны ліст да *Laurae Academicae Serenissimo Poloniarum Regi Vladislao IV* з выявай герба Уладзіслава IV Вазы. *Вільня, 1633 год.*

шаюцца алегарычныя постаці Улады, якая трымае ў руцэ Фартуну (у традыцыйнай іканаграфіі: дзяўчына на шары з ветразем у руках), і Славы з лаўровымі галінкамі, што разам падтрымліваюць партрэт караля. Арол (які адсылае нас адначасова да польскай і прускай геральдыкі і сімвалаў улады антычнага Рыма) трымае лаўровы вянок над галавой манарха. Унізе змешчаныя трафеі і палонныя маскоўцы ды туркі. Гербы Польшчы і Швецыі знаходзяцца ўверсе каля партрэта караля разам з гербам Вазаў. Пагоню ж мы бачым на калоне, разам з гербамі Каралеўскай Прусіі, Малдавіі, Русі (галіцкі Леў), Мілана (герб Сфорцаў) і Мазовіі – зямель, якія асацыяваліся з суверэнітэтам або прэтэнзіямі Польскай кароны.

Зрэшты, трэба заўважыць, што падобныя інтэрпрэтацыі геральдыкі каралёў з дынастыі Вазаў былі хутчэй рэдкасцю, і значна часцей мы сустракаем складаны падвойны герб Рэчы Паспалітай і Швецыі, апісаны вышэй (іл. 12).

Іл. 11. Трыумфальная арка ў гонар караля Уладзіслава IV. *Е. Фальк, Гданьск, 1646 год.*

Іл. 12. Вымпел да трубы або барабана гвардыі Жыгімонта III Вазы з яго гербам.
1610-1630-я гады.

V. Сэнсы Айчыны

Варта закрануць яшчэ адзін цікавы выпадак выкарыстання сімволікі Пагоні ўжо не ва ўласна каралеўскай прапагандзе, а ў прапагандзе магнацкай, але правазаўскай, раялісцкай скіраванасці. Гэта тытульны ліст (іл. 13), выкананы гравёрам Конрадам Гётке да выдання панегірыка ў гонар Пятра Паца аўтарства Яна Сленскага 1642 года (Slęsky, 1642). Вельмі багатая па сваім алегарычным напаўненні гравюра адлюстроўвае Пятра Паца ў цэнтры амфітэатра (*Patriae,* Айчыны). Ён шчодра даруе грошы кліентам, царкве і войску. Дынастыя Пацаў алегарычна адлюстраваная ў вобразе чароўнага саду перад амфітэатрам, а яе прадстаўнікі ў выглядзе кветак. Над брамай пад надпісам змешчаная вялікая літоўская Пагоня, таксама на ганаровым месцы, дзе паводле рымскае традыцыі сядзелі імператары, знаходзіцца вялікі Белы Арол са "Снапом" Вазаў на грудзях. Вакол на сценах іншыя, меншыя гербы: двухгаловы арол (Расія ці Свяшчэнная Рымская імперыя?), жамойцкі, міланскі (герб Сфорцаў, спадчыннікам якіх быў Жыгімонт II Аўгуст, а значыць і Вазы), вялікапольскі, малапольскі.

Інтэрпрэтаваць такі вобраз *Айчыны* можна вельмі па-рознаму. Хутчэй

Іл. 13. Тытульны ліст да *Decora Lilieti Petri Pac. K. Гётке, Вільня 1642 год.*

за ўсё амфітэатр уяўляе сабой вобраз супольнай Рэчы Паспалітай, а гербы рэпрэзентуюць розныя землі пад уладай караля з дынастыі Вазаў. Літва сярод іх для літоўскага дыгнітарыя на ганаровым месцы, *Patriae*. У пэўным сэнсе гэта сведчанне складанай ідэнтычнасці тагачасных эліт, якую часткова можна праілюстраваць вядомай умоўнай формулай *gente Lithuanus, natione Polonus.*

Такі вобраз супольнай Рэчы Паспалітай і Літвы як яе часткі ва ўяўленні літоўскіх эліт цяжка было б сабе ўявіць яшчэ зусім нядаўна, але ў сярэдзіне XVII ст. ці напрыканцы панавання Вазаў агульныя патэрны сармацкай культуры, польская палітычная культура і адпаведная ідэнтычнасць досыць моцна пашырыліся на тэрыторыю ВКЛ. Звычайна такі вобраз выступаў у форме антрапаморфнай выявы – жанчыны, панны, якая сімвалізавала Рэч Паспалітую як адну з карон Вазаў. Напрыклад, у антверпенскім медзярыце Шэльтэ Бальсверта 1624 года *Алегорыя кіравання Жыгімонта III* выяўлены кароль на маястаце ў каранацыйным строі і з Ордэнам Залатога Руна, атачоны алегарычнымі постацямі: па правую руку – шчаслівая Мінеўра (уласна Рэч Паспалітая), злева – Швецыя ў жалобных шатах (сімвалізуе падзеі, звязаныя з дэтранізацыяй Жыгімонта), каля Мінеўры – Масковія, якая перадае вялікакняскую шапку Жыгімонту (напамін аб падзеях расійскай Смуты), насупраць яе – пакорлівая асманская Порта з аліўкавай галінкай міру (пасля польска-літоўскай перамогі пад Хоцінам).

У антыкаралеўскай прапагандзе, якая стаяла на пазіцыях абароны "залатых вольнасцяў", актыўна выкарыстоўваліся вобразы *Res publica* або *Libertas*. Як прыклады можна ўзгадаць выяву алегорыі *Вольнасці* на троне з мячом і з кнігай (алегорыя правоў) у трактаце Анджэя Лісецкага *Apologia pro Liberate Republicae* 1626 года, які абараняў ідэю шляхецкай дэмакратыі і асаблівай ролі шляхты ў стварэнні прававой сістэмы (Lisiecki, 1626).

Часам гэтыя вобразы перакрыжоўваліся, як, напрыклад, алегорыя *Рэчы Паспалітай* у кароне са сцягам (Белы Арол са снапом Вазаў), якая сядзіць на трафеях, з тытульнага ліста да кракаўскага выдання *Лехіяды* Альбрэхта Інэса 1655 года (Ines, 1655).[8] У 1633 годзе каралеўскі сакратар і паэт Генрык Хелхоўскі (Chełchowski, 1633) атаясамліваў вобраз Рэчы Паспалітай з целам алегарычнага Арла, а Літву параўноўваў з адным з яго крылаў:

Sławnego Orła piersi: Polacy waleczni,
Skrzydła: z odważną Litwą Rusowie serdeczni,
Mazowszanie z Prusaki: nogi niezwątlone,
Barki: Małopolanie, na których wzmocnione
Ciało Korony Polskiej zawisło w pomocy.
(цыт. пав.: Wisner, 2009: 112)

[8] Гл. ілюстрацыю 14.

Іл. 14. Алегарычная выява Рэчы Паспалітай з тытульнага ліста *Лехіяды* А. Інэса. *Кракаў, 1655 год.*

Заключэнне

Каралеўская і (умоўна) шляхецкая прапаганда напаўняла візуальна блізкія вобразы супольнага Польска-Літоўскага гаспадарства, адной Рэчы Паспалітай, вельмі розным сэнсам. Калі ў першым выпадку гаворка хутчэй аб кароне, каралеўскай вотчыне, то ў другім – аб панстве шляхты, *Reipublicae* (Augustyniak, 1999: 85–86, 99). У кантэксце шматлікіх канфліктаў гэтага перыяду, унутраных і знешніх, паралельна з палітычнымі дэбатамі, інтрыгамі і вайсковымі дзеяннямі разгортваліся сапраўдныя бітвы візуальнай прапаганды варожых бакоў, якія ўвасаблялі іх супярэчлівая амбіцыі, прэтэнзіі і палітычныя праграмы. Барочная "вайна мастацтваў" у матэрыяльным вымярэнні абыходзілася тым, хто наважваўся яе абвясціць, часам не танней за вайсковыя дзеянні. Такая форма супрацьстаяння абумовіла шырокі распаўсюд візуальных матэрыялаў і ў Рэчы Паспалітай, дзе кароль і шляхта імкнуліся стварыць свой уласны вобраз дзяржавы і найбольш справядлівага, на іх бачанне, палітычнага ладу.

Адным з бакоў, які фактычна прайграў у гэтай "вайне", была эліта ВКЛ і вобраз Вялікага Княства як асобнай дзяржавы. З паступовай трансфармацыяй ідэнтычнасці шляхты на працягу XVII ст. (не ў апошнюю чаргу пад уплывам польскай шляхецкай прапаганды, а таксама глыбокай культурнай траўмы, атрыманай пад час вайны 1654–1667 гадоў), калі на змену рымскаму міфу аб яе паходжанні прыходзіць сармацкі міф з адпаведнай ментальнасцю і наборам культурных кодаў, натуральным чынам змяняліся і візуальныя сімвалічныя рэпрэзентацыі Вялікага Княства Літоўскага, на змену якім прыйшоў вобраз супольнай Рэчы Паспалітай (у выглядзе Панны, Арла і гэтак далей), неад'емнай часткай якой была і гістарычная Літва.

Можна згадаць хіба яшчэ выгодны для Міхала Карыбута Вішнявецкага, наступніка Яна II Казіміра Вазы на пасадзе, панаванне якога было зусім кароткім, вобраз Пагоні-*Літвы* як аднаго з легендарных фамільных сімвалаў Карыбутавічаў. Але нават у гэтым выпадку мы маем справу з адзінкавымі выпадкамі, такімі як, напрыклад, гравюра з віленскага выдання Феліцыяна Арліцкага *Comissio*

Hierarchiae з выявай Пагоні (над ёй – Белы Арол з гербам Вішнявецкіх) на скале і дэвізам *His Secura Stabis* (Orlicki, 1671).

Са стратай Літвой сваёй палітычнай вагі напрыканцы панавання дынастыі Вазаў і асабліва ў выніку катастрафічных для яе ў матэрыяльным і духоўным сэнсе наступстваў Трынаццацігадовай вайны 1654–1667 гадоў (Сагановіч, 1995: 130–134), месца ВКЛ у візуальнай прапагандзе як каралеўскага двара, так і шляхты набывае ўсё больш маргінальныя рысы, і ў XVIII ст. канчаткова выцясняецца на межы культурнай перыферыі.

Бібліяграфія

1. Сагановіч, Генадзь (1995). *Невядомая вайна.* Мінск: Навука і тэхніка.
2. Ярашэвіч, А. (2002). "Святы Казімір у гісторыі і мастацтве", *Наша Вера,* 1(19): .
3. Albizius, A. (1612). *Principum christianorum stemmata,* Augusta Vindelicorum.
4. Augustyniak, U. (1999). *Wazowie i "królowie rodacy". Studium władzy królewskiej w Rzeczypospolitej XVII wieku.* Warszawa: Semper.
5. Barker, R. (2001). *Legitimating Identities: The Self-Presentations of Rulers and Subjects.* Cambridge: Cambridge University Press.
6. Benedict, P., Gutmann, M. P. (2005). *Early modern Europe: from crisis to stability.* Newark: University of Delaware Press.
7. Bourricaud, F. (1987). "Legitimacy and Legitimization", *Current Sociology,* 35: 57–67.
8. Braun, G., Hogenberg, F. (1575). *Civitates orbis terrarum,* vol. II, Colonia Agrippina.
9. Chasseneux, B. (1529) *Catalogus gloriae mundi,* Lugdunum.
10. Chełchowski H. (1633) *Orzeł odmłodzony Królestwa Polskiego... przez fortunne Korony osiągnienie... Władysława IV.* Toruń.
11. Chrościcki, J. A. (1982). *Sztuka i polityka, Funkcje propagandowe sztuki w epoce Wazów 1587–1668.* Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe.
12. Chrościcki, J. A. (2001). "The Struggle for the Swedish and Polish Throne during the Reign of Sigismund III Vasa. Between Polish and Swedish Propaganda," w K. Połujan (red.), *Stosunki polsko-szwedzkie w epoce nowożytnej*. Warszawa: Zamek Królewski w Warszawie: 47–61.
13. Falniowska-Gradowska, A. (1991). *Wjazd, koronacja, wesele Najjaśniejszej Królowej Jej Mości Cecylii Renaty w Warszawie roku 1637.* Warszawa: Zamek Królewski w Warszawie.
14. Friedrich, K. (2004) "Royal Entries into Cracow, Warsaw and Danzig: Festival Culture and the Role of the Cities in Poland-Lithania," in J.R. Mulryne, H. Watanabe-O'Kelly and M. Shewring (eds), *Europa Triumphans: Court And Civic Festivals In Early Modern Europe*, vol. I. Aldershot and Burlington VT: Ashgate: 386–391.
15. Ines, A. (1655). *Lechias Principum ac Regum Poloniae elogia historico-politica et panegyres liricae.* Cracoviae.
16. Lewański, J. (1973). "Świadkowie i świadectwa opery władysławowskiej", w J. Lewański (red.), *Studia Staropolskie,* t. XXV: *Opera w dawnej Polsce. Na dworze Władysława IV i królów saskich.* Wrocław: 25–60.
17. Lisiecki, A. *Apologia pro Liberate Republicae* (1626). Cracoviae.
18. Matikkala, A. (2008). *The orders of knighthood and the formation of the British honours system 1660–1760.* Chippenham: Antony Rowe.
19. Mörke, O. (2003). "The Symbolism of Rulership," in M. Gosman, A. MacDonald and A. Vanderjagt (eds), *Princes and Princely Culture 1450–1650,* vol. 1. Leiden and Boston: Brill Academic Publishers: 31–50.

20. Munck, Th. (1990). *Seventeenth-Century Europe: State, Conflict and Social Order in Europe 1598–1700.* New York: St. Martin's Press.
21. Nassinger, L. (2004). "Gründtliche vnd Kurtze Beschreibung des Einzuges welchen der... Herr Sigismundus der dritt dises NamensKönig in Poln geborner König in Schweden... zu Krackaw gehalten," in J.R. Mulryne, H. Watanabe-O'Kelly and M. Shewring (eds), *Europa Triumphans: Court And Civic Festivals In Early Modern Europe,* vol. I. Aldershot and Burlington VT: Ashgate: 414–419.
22. O bezkrólewiu po śmierci Stefana Batorego przez Horacyusza Spanocchi, sekretarza kardynała Bolognetto, nuncysza w Polsce w ostatnich latach panowania tego króla (1864), w J. Albertrandi (oprac.), *Relacje nuncjuszów apostolskich i innych osób o Polsce od roku 1548 do 1690,* t. I. Berlin-Poznań.
23. Olszewski, I. (1632). *Snopek... Zygmunda III, krola Polskiego y Szwadzkiego, w książęcia Litewskiego,* Vilnae.
24. *Opis wjazdu, koronacji i wesela Cecylii Renaty i Władysława IV,* BCz (Biblioteka Czartoryskich w Krakowie), rps. 1662.
25. Orlicki, Fr. F. (1671) *Commissio hierarchiae caelestis seu angeli,* Vilnae.
26. Rabb, K.T. (1975). *The struggle for stability in early modern Europe.* New York: Oxford University Press.
27. Radziwiłł, A.S. (1980). *Pamiętniki o dziejach w Polsce,* oprac. A. Przyboś i R. Żelewski, t. II: 1637–1646. Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy.
28. Rożek, M. (1976). *Uroczystości w barokowym Krakowie.* Kraków: .
29. Sarnicki, S. (1594). *Statuta y Metryka przywileiow koronnych,* Krakow.
30. Slęsky, I. (1642) *Decora Lilieti Ill[uistrissi]mi D.D. Petri Pac, Palatini Trocen[sis],* Vilnae.
31. *Stefana Batorego dyplomatyczne rokowania ze Szwedami w 1582 roku,* BPAN w Krakowie, rkps. 2523.
32. *Via augusta, qua... Principem Carolum Ferdinandum, episcopum Plocensem* (1644), Vilnae.
33. Von Hagenow, E. (1998) "The Royal Portrait with Allegorical Commentary: Royal Propaganda in the confessional wars of the sixteenth and seventeenth centuries," in K. Bussmann and H. Schilling (eds), *1648: War and Peace in Europe,* vol. 2: *Art and Culture.* Münster-Osnabrück: Bruckmann: 61–68.
34. Vorbek-Lettow, M. (1968) *Skarbnica pamięci: pamiętnik lekarza króla Władysława IV,* wyd. E. Galos i F. Mincer. Wrocław – Warszawa – Kraków: .
35. Wassenbergius, E. (1643). *Gestorum partes duae, Vladislai quarti Poloniae et Sueciae regis.*
36. Weber, M. (1978). *Economy and Society: An outline of interpretive sociology,* vol. 2, eds. G. Roth and C. Wittich. Berkeley: University of California Press.
37. Wisner, H. (2009). *Władysław IV Waza.* Wrocław: Zakład Narodowy im. Ossolińskich.
38. Wisner, H. (2009). *Zygmunt III Waza.* Wrocław-Warszawa-Kraków: Zakład Narodowy im. Ossolińskich.
39. Zenowicz, I. (1633). *Laurae Academicae Serenissimo Poloniarum Regi Vladislao IV.* Vilnae.